Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 38 (537). Вільня, Нядзеля 5 Лістапада 1933 г. Год IX (XVII)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Завальная вул. 1-1. (Wilno, ul. Zawalna 1-1). Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел. КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл., Заграніцу ўдвая даражэй. ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Што маем і чаго жадаем.

Праваслаўным беларусом прыходзіцца няраз чуць з боку расейскага, што мы сваімі вымогамі разбураем Царкву, зьніштажаем яе еднасьць і гэткім чынам памагаем яе ворагам.

Закіды гэтыя паходзяць з боку людзей, якіх як раз сама ідэя Царквы мала абходзіць, якія не разумеючы, або і ня хочачы зразумець сучаснага палажэньня Праваслаўя, хацелі б вярнуць яго на дарогу б. царскае палітыкі, або намагаюцца выкарыстаць яго дзеля мэтаў, якія прадусім цікавяць расейскую эміграцыю.

Наша змаганьне ня ёсьць насьледкам сьляпога і шкоднага Царкве шовінізму, якім грэшаць тыя, што робяць гэты закід нам. Мы нашым змаганьнем імкнёмся да ўзмацаваньня Царквы праз прыбліжэньне яе да беларускіх масаў, праз пашырэньне рэлігійнае сьведамасьці ў роднай мове, праз удзел беларусоў у кіраваньні Царквой і праз давядзеньне нашага царкоўнага жыцьця да сабарнасьці, у якой голас беларускі знайшоў-бы належнае сабе мейсца. І ад выкананьня гэтага абавязку нас ня стрымаюць ніякія перашкоды.

Мы ня маем жалю, а тымбольш ненавісьці да расейскае Царквы за паняволеньне самастойнасьці нашай беларускай Царквы, бо ведаем, што гэта здарылася больш з прычыны сьвецкае палітыкі, якой прыладаўздзем сталася расейская Царква. Мы сумуем і молімся за нашых аднаверцаў расейцаў і іхнюю Царкву, просячы ў Бога помачы проці ворагаў сьв. Крыжа. Аднак-жа разам з гэтым ня можам закрываць вачэй на тыя прычыны, якія давялі расейскую Царкву да яе цяперашняга палажэньня. А прычынай гэтага было прадусім падпарадкаваньне вечнае ідэі Царквы зьменнай сьвецкай палітыцы. Гэтае падпарадкаваньне выразілася ў канцы ў т. зв. сынадальна-кансысторскіх парадках і ў духу, які затруціў духоўны арганізм Царквы і спаралізаваў яе найважнейшы нэрв, якім было манашэства, з каторага зрабіў штось пасярэдняга між таўпой нічога ня робячых гультаёў і кучай кар'ерыстаў, шукаючых архіерэйскіх мітраў.Гэтае падпарадкаваньне Царквы сьвецкай палітыцы зьніштожыла супольнасьць між іерархіяй і народам, зьвёўшы ўсе абавязкі народу да веры і Царквы, да вонкавага фармалізму (скуль пагаворка „казённая вера"). Духавенства, дзякуючы палітычным перашкодам, ня мела ўплыву на народ (стуль такая пагарда расейцаў да духавенства). Гэткае палажэньне ў канцы давяло да бязьверра, а Царкву да цяжкага крызысу.

Праўда, былі ў расейскай Царкве і сьв. ўгоднікі, і сьветлыя архіерэі, і вучоныя багасловы, але яны адыгралі ў жыцьці царкоўным ролю тых падарожных слупоў, якія паказывалі кірунак царкоўнага жыцьця, але гэтай дарогай ні большасьць архіерэяў з духавенствам, ні неразумеючы веры народ, не пайшлі, або ўжо і не маглі йсьці. Гэтага сынадальна-кансысторскага духу мы і баёмся ў нашай Царкве і з ім мусім змагацца, тым больш, што маем за шмат сярод нашае іерархіі людзей, якія стараюцца аб утрыманьні яго і ў нас.

Прыкладам гэтага можа быць віленская епархія. дзе роля беларускага народу праз расейшчыну зьведзена да ролі нявольніка, які толькі павінен плаціць грошы да маўчаць. А там, у віленскім манастыры, спраўляе сваё вясельле расейскі сынадальна-кансысторскі дух. Дзейнасьць гэтага духу рэхам расходзіцца між народам, змушаючы чырванець з сораму праваслаўных беларусоў.

Дзякуючы гэтаму духу, маем сярод праваслаўнага духавенства б. бальшавіцкіх камісараў, маем сьвяшчэньнікаў, якія публічна (пры бальшавіках)зракліся сьвяшчэнства,маем таргоўлю разводамі, ды маем розных „валынскіх" мітратаў і „іжэ с німі", якія на ўсе лады беламуцяць народ, стараючыся прад ім чамусьці абляць чорнасоценную маскоўшчыну, з яўнай шкодай для Царквы і самога беларускага Народу. Маем у канцы такое нялюдзкае зьявішча, што загадваецца каля 80 сьвяшчэньнікам зараз-жа ўнясьці неаплачаныя падаткі на мітраполію, або ўступіць з прыходу.Цікава, адкуль яны гэтыя грошы возьмуць, калі ўжо 60 проц. сьвяшчэньнікаў не пасылае дзяцей у школу, а народ не дае, бо і сам ня вельмі мае, а пры тым а. місіянэр Рагальскі сваімі чорнасоценскімі расейскімі выступленьнямі выклікаў недавер народу. Маем затое вырастаючую на гэтым грунце сільную місіянэрскую польска-чорнасоценскую дзейнасьць кс. Любяньца, а так-жа сэкт і бязбожніцтва. А пасрэднім віноўнікам гэтага непарадку ў віленскай епархіі зьяўляецца архіепіскап Хвядос, які, як чалавек ужо стары і хворы, а пры гэтым дужа мяккага сэрца, папаў пад уплывы розных прайдзісьветаў, даводзячых віленскую епархію да поўнага занепаду.

Дзеля гэтага мы жадаем, каб у Вільню быў назначаны вікарны епіскап з правамі самастойнага епархіяльнага архіерэя, які-б да ўступленьня архіеп. Хвядоса ўпраўляў за яго епархіяй.

Дамагаемся ўрэшце, каб гэты вікарны епіскап сапраўды (а не на славах) стаяў на становішчы патрэб нашае беларускае Царквы, быў старым манахам, не маляваным, якіх цяпер робяць, каб быў пабожным, каб меў вышэйшую багаслоўскую адукацыю (а не ваенную школу), каб быў вольным ад расейскага або іншага шовінізму, каб быў праняты духам сабарнасьці і каб умеў і хацеў бараніць Царкву і народ ад ворагаў.

Іван Міранович.

Не палёгка, але адсрочка.

Польскі закон аб самаўрадах з дня 23.III. с. г вымагае, як ведама, каб солтысы і нават падсолтысы ўмелі гаварыць і пісаць папольску. Правядзеньне гэтага пункту закону ў жыцьцё на землях беларуска-літоўска-украінскіх мусіла хіба аднак аказацца непасільным для самых нават законадаўцаў, бо вось дня 28 г. м. зьявілася міністэрскае распараджэньне, якое гэты пункт закону для нашых зямель замяняе на новы. Папраўкай абняты ваяводзтвы: Віленскае, Наваградзкае, Палескае, Валынскае і часьць Беластоцкага (паветы: Беластоцкі, Бельскі, Сакольскі і Ваўкавыскі). Паводле гэтай папраўкі падсолтысы на названых абшарах скрось звальняюцца ад абавязку ўмець гаварыць і пісаць папольску; солтысы ў Наваградчыне звальняюцца ад абавязку ўмець папольску пісаць, а ў Віленшчыне і на Палесьсі для солтыса няма абавязку ўмець папольску ані пісаць, ані гаварыць.

Гэту быццам уступку для большасьці няпольскага, у тым ліку і беларускага, насельніцтва нашых зямель ня можна лічыць уступкай для правоў нашай мовы ў самаўрадзе. Не! Зьмена гэта вымушана самым жыцьцём, бо нікому-ж не сакрэт, што калі б гэтай зьмены ня было, дык сягоньня ня можна было-б на мейсцы ў нас знайсьці патрэбнага ліку людзей, якія маглі-б адпавядаць закону, г. зн. умелі гаварыць і пісаць папольску: усе, хто знае польшчыну — большыя і меншыя абшарнікі — даўно ўжо займаюць у нас пасады цяплейшыя ды і то трэба было ім даць у прыпрэжку вайсковых асаднікаў з Польшчы.

Што гэта ўсё так, пацьвярджаецца яшчэ і тым, што названая нібы палёгка языковая для нашых зямель установлена не на заўсёды, а толькі на тры гады, г. зн. пакуль мясцовыя людзі ня прывыкнуць больш да польскай мовы.

З гэтай прычыны ня можна гаварыць аб палёгцы, а толькі аб адсрочцы. **н.**

БЕЛАРУС. АДРЫУНЫ КАЛЕНДАР на 1934 год ужо паявіўся ў прадажы па 60 грошаў за экз. Пры закупліваньні 10экз.—50гр.,25экз. 48г.,100экз.—45гр. Кнігарня «Пагоня» Вільня, Завальная 1. Кожны беларус купляе календар беларускі!

З беларускага жыцьця.

Навуковы рэфэрат аб зьмене беларускага правапісу ў Б.С.Р.Р. Дня 28.X. с. г. Віленскі Аддзел Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры наладзіў у залі Інстытуту (Вільня, Завальная 1—1) навуковы рэфэрат аб зьмене беларускага правапісу ў Б.С.Р.Р.

Рэфэрат прачытаў др. Я. Станкевіч. Пасьля рэфэрату адбылася дыскусія.

Рэфэрат і дыскусія выказалі, што:

1) рэформа беларускага правапісу патрэбна, а так-жа трэба ачышчаць беларускую мову ад чужацкіх уплываў;

2) гэтай справай (рэформай бел. правапісу) павінны заняцца беларускія вучоныя і філёлёгі з усіх часьцін Беларусі;

3) а маскоўскія і польскія камуністы, рэформуючы ў Б.С.Р.Р. пасвоему беларускі правапіс, калечаць беларускую мову, упадабняючы яе да мовы расейскай.

Словам, рэфэрат і дыскусія пацьвердзілі, што паліцэйскі спосаб рэформы беларускага правапісу ў Б.С.Р.Р. ня можа лічыцца за дадатні для беларускай культуры, а наадварот — зьяўляецца ёй шкодным.

Папраўка і дапаўненьне. Пры падаваньні ў апошнім нумары „Бел. Крыніцы" новага адрэсу Кс. Ад. Станкевіча закралася малая памылка ў нумары кватэры. Правідловы адрэс выглядае гэтак: Вільня, завулак сьв. Ігната № 9, кв. 11-б (папольску — Wilno, św. Ignacego № 9 m. 11b), побач касьцёла сьв. Духа (па-Дамініканскага). Паўтараем, што набажэнства для беларусоў-каталікоў і далей, ак дагэтуль, кожную нядзелю і сьвята а гадз. 10-ай рана, адпраўляецца ў касьцеле сьв. Мікалая (зав. сьв. Мікалая 8).

З газэт.

Як яна „разумее"?!

„Беларуская Газэта" (№ 9 з 18.X.1933) рэформу беларускага правапісу ў Савецкай Беларусі тлумачыць разам з уласьцівым гэтай газэце слоўніцтвам апаганеньня „Беларускай Крыніцы" — правам беларускага правапісу на разьвіцьцё і дасканаленьне „разам з разьвіцьцём беларускае мовы".

Выглядае так, што беларуская мова самахоць разьвіваецца ў бок расейшчыны і да гэтага разьвіцьця мае дапасавацца беларускі правапіс! Гэткае зьявішча, пэўне-ж, можа быць агулам, але з беларускай мовай цяпер яшчэ так ня ёсьць.

На дэмагогічную (ўсё там дэмагогія!) заўвагу „Бел. Газэты“ аб тым, што Купала, Колас і Тарашкевіч, будучы сябрамі Беларускай Акадэміі Навук, якая „выпрацавала рад зьмен у беларускім правапісе“, — сталіся-б, паводле „Бел. Крыніцы“ „ліквідатарамі“ — праз гэны правапіс — беларускае мовы, — кожны „пры сваіх“ і не пад каманду адкажа, што ані Колас, ані Купала, ані тымбольш Тарашкевіч, які падчас рэформаваньня беларускага правапісу ня быў яшчэ ў Менску (бо да 6.IX.33 сядзеў у польскім вастрозе), ня ёсьць ліквідатарам і беларускае мовы. Ліквідацыя беларускае мовы і агулам праціўбеларускі курс адбываецца міма іх волі. Яны-ж, як і многія іншыя беларусы, ня могуць супроцьставіццабальшавіцкаму злачынству проціў беларускага народу ў краіне прымусу і т. зв. дыктатуры пролетарыяту, якой ёсьць сяньня С.С.С.Р.

У гэтай краіне кожны, апроч дыктатара і яго клікі, зьяўляецца — не абражаючы тут гонару ўспомненых выбітных Беларусоў — бязвольным стварэньнем і проста манэкінам!

Архімандрыт Феафан.

Мітрапалітальнае „Слова“ падае, што 23.X с. г. сябра Варшаўскай Кансысторыі сьвяшч. Хвядос Пратасэвіч прыняў стан манаха пад імям Феафана, а 24.X абдараваны ўжо санам архімандрыта. Гэтулькі падае „Слова“.—Цікава ведаць,куды ўсё гэта кіруецца, бо „манашэства для манашэства“ тут вуключана.

Што дзецца ў Пінскай Праваслаўнай Кансысторыі?

Польскія газэты падаюць, што ў Праваслаўнай Кансысторыі ў Пінску выкрыты вялікія надужыцьці, даходзячыя да мільёна зл. — Калі гэта праўда, дык сумныя плады расейска-кансысторскай гаспадаркі на нашых землях.

І—іч

Як жывуць сяляне ў Незалежнай Літве.

(*„Viln. Rytojus“ № № 74—77*).
(Гл. „Бел. Крыніцу“ № 37).

Сёлета летам давялося мне адведаць Незалежную Літву і пазнаёміцца з сялянскім жыцьцём Марыямпальскага пав., Кальварыйскай гміны. Здарылася быць у сярэдніх сялян-гаспадароў (24 га. зямлі). Няможна сказаць, каб іх гаспадаркі вяліся цалком па сучаснаму, але ня гледзячы на гэта, гаспадары гэныя бадай кожны месяц атрымоўваюць за малако па 70 літаў (да 40 залатовак).

Здаралася мне так-жа пазнаёміцца з гаспадаркай большай (85 га. зямлі), паложанай недалёка ад Коўна. Уласьнік гэтай гаспадаркі казаў, што за тыя грошы, якія бярэ за малако, ён аплачвае ўсе падаткі і ўсе зьвязаныя з гаспадаркай патрэбы (аплата сталых наймітаў, падзённых і інш.). Знача, ўсе іншыя даходы з гэтай гаспадаркі йдуць на іншыя патрэбы.

Астаткі ад малака, пасьля пераробкі яго ў малачарнях, сяляне забіраюць назад і кормяць ім сьвіней, якіх прадаюць звычайна так-жа спосабам арганізаваным.

Гадоўля сьвіней у Нез. Літве і выраб сьвіннога мяса дужа пашыраны.Мяса літ. сьвіней (бэконы!) надта любяць англійцы і шмат яго купляюць. Добрага мяса нельга прыгатаваць з абы якой сьвіні. Найлепшае мяса сьвіней англійскай пароды, іоркшыраў.

Вось-жа сьвіней гэтай пароды сяляне ў Літве найбольш і гадуюць і з іх маюць значны даход. Збыт гэтага тавару там арганізаваны. Гдзе і як прадаваць яго — вучаць аграномы і інструктары, а скупляе тавар, прыгатаўляе і вывозіць у Англію прадаваць акцыйнае Т-ва „Maistas“.

Гэта таварыства мае ў Літве пяць мясных фабрыкаў: у Коўне, Клайпэдзе, Панявежы, Таўрогах і новую — збудаваную і арганізаваную паводле вымогаў найнавейшай тэхнікі — у Шаўлях. Гэта апошняя пачала дзеіць толькі нядаўна. У гэтых фабрыках скупленых сьвіней мяса прыгатаўляецца на продаж. Сьвіней скупляюць агенты „Maistas“ праз земляробскія коопэратывы. Аднак, каб гэтыя агенты часам людзей ня крыўдзілі і не плацілі менш, чым сьвіня сапраўды варта, купля гэтак арганізавана: падаецца да агульнага ведама, што тады і тады, у такім і такім раёне адбудзецца купля сьвіней. На азначаны дзень і ў азначанае месца (неканешна ў места) сяляне звозяць адкормленых сваіх сьвіней. Азначаным мейсцам звычайна бывае бліжэйшая станцыя чыгункі. Прыбыўшыя ад Т-ва „Maistas“ агенты прывезеных сьвіней аглядаюць і прынятым прычэпліваюць да вуха нумар. Квіт з такім самым нумарам даецца ўласьніку сьвіні, а так-жа і задатак да 60 літаў. Але сам агент сьвіні не ацэньвае. Аканчальную цану ўстанаўляе фабрыка паводле гатунку мяса, сусім ня ведаючы, хто зьяўляецца ўласьнікам кожнай сьвіні. Забітых і абчышчаных сьвіней сартуюць спэцыялісты, якія натуюць у кніжках, што сьвіня такога і такога нумару мае столькі і столькі вагі, што яна такога і такога сорту і г. д. Гэткім спосабам устанаўляецца праўдзівая цана на сьвіней. Рэшта належных грошаў уласьнікам сьвіней адсылаецца пасьля гэтага безадкладна. Разам з грашмі пасылаецца сялянам запіска, у якой паказаны купленай сьвіні заганы і добрыя яе староны, каб сяляне знали, як трэба сьвіней гадаваць і карміць, каб яны былі першага сорту і каб далі як найбольш даходу.

Пераклаў **М. К.**

Да праваслаўных царкоўных дзеячоў

У справах датычачых беларусізацыі Праваслаўнае Царквы ў нашым Краю просім зварочвацца ў Праваслаўную Камісію Беларускага Нацыянальнага Камітэту (Вільня, Завальная 1—1), якая спэцыяльна для гэтых спраў паўстала. У рэдакцыю просім і далей прысылаць матэрыялы празначаныя толькі для газэты.

РЭДАКЦЫЯ «Б. КРЫНІЦЫ»,

Keturakis.

Ameryka ŭ łaźni. 4)

Kamedyja ŭ troch dziejach.

Z litoŭskaj mowy pierakłaŭ
St. Marcinkiewič.

(Praciah, hl. „Biel. Krynicu“ Nr. 36).

Wincuk (*uwachodzić*). A wy, dziadźka, tut!

Harbuz Pa puhu zabiehsia, ci treba što? (*kałupaje cybuk*).

Wincuk. Ja dziadźku dobruju reč skažu.

Harbuz. A što takoje, Wincučok?

Wincuk. Ja tut adnaho čaławieka abdurniŭ, možna dastać hrošy: dziadźka niadaŭna zdajecca mianie prasiŭ?

Harbuz. A što-ž rabić nie prasiŭšy? Tolki ciapier świet hetki: kali druhi i maje, to dziaržyć ścisnuŭšy (*napichaje cybuk*).

Wincuk. Kali dziadźka nia ŭmieješ šukać. Čamu ja...

Harbuz. Ci ty nie śmiaješsia?

Wincuk. Za kaho dziadźka mianie maješ? Ja hawaru, što našoŭ takoha čaławieka, budué hrošy i ŭsio.

Harbuz. (*kładzie ŭ kišeń cybyk i kapšuk*) Łaska Božaja! A kolki jon mnie moh-by?

Wincuk. Tak jak prasiŭ — dźwieście; užo ŭsio zładžana. Tolki nam jaho treba abchitryć, widziš — jon choča da was u ziaci.

Harbuz. Ale, kab jaho lichačka: to-ž jon u ziaci! Kab jon tak moh-by... było-b ništo...

Wincuk. Ab hetym, dziadźka, nie biaduj: jon usio moža, jak my zachočam, tak jon budzie mahčy. Tolki na mianie zdajciesia, to ŭsio budzie dobra.

Harbuz. Kab jon biez raśpiski moh..

Wincuk. Ab hetym nie ŭspaminajcie! Wy dziadźka, lapiej tak biarecie, jak jon choča.

Harbuz. E-e! Chitryja wy! Wam maładym zdajecca, što kali Harbuz maje doŭhu, to ŭžo biaz ziacia nia źwierniecca! A ziać Harbuza za kaŭnier i ŭ zapiečča, a sam z hrašmi pryšoŭšy na majo dabro budzie panawać. Ech, dzieci wy, dzieci! Jašče wy ŭwidziecie, što Harbuz zrobić! Kali Boh dašć pražyć, — wypłaču daŭhi, panapraŭlaju budynki, tady ŭbačycie, što wam Harbuz zapiaje! A ciapier...

Wincuk. Kali ty, dziadźka, mianie nie razumieješ; ja tabie kazaŭ, kab ty tolki znarokam tak prykinuŭsia, što ty, dziadźka, niby patrabuješ ziacia, što byccam budzieš mahčy apisać na jaho haspadarku, kali tolki dobry čaławiek nawiniecca — razumieješ? Tolki datul na ŭsio hadzisia, pakul z jaho hrošy dastanieš, a paśla, to možaš jaho ŭsiak krucić, što jon i sam adračecca.

Harbuz. A-a! dyk ty hetak!... dobra ty kažaš.

Wincuk. A kali tolki dziadźka patrapiš z im abyjścisia, to paśle ad jaho i balej hrošy dastanieš: jon zaŭsiody pry hrašoch.

Harbuz. A kab ciabie haručka! Nu što-b tabie było paprasić jakich 500 załatych, nu chacia 400, kali kažaš, što jon maje? Wiedaješ, kab tak u jaho paprasić, moža dasca nahawaryć?..

Wincuk. Nie, dziadźka, nie napaminaj bolej, bo možaš uwieś interas papsuć. Tolki dźwie sotni prasi, a bolej nie patrabuj (*padumaŭšy*). A moža... E, jak adnamu chwacie.

Harbuz. Kažaš, Wincučok, chwacie: kab tolki-ž tamu adnamu treba było!

Wincuk. Dziadźka! Biareš dźwie sotni? A nie — to astawajsia zdaroŭ!

Harbúz. Biaru, biaru, Wincučok, chto-ž hawora, što nie biaru.

Wincuk. (*cicha*) Nu hetak. Nie ŭspaminaj jamu ab bolšaj sumie ani trochi; usio tady papsawałasia-b.

Harbuz. Wincučok ja ani słoŭca. Daj Boža tabie zdaroŭja! Niachaj budzię choć dźwie sotni: što-ž zrobiš, kali-ž sioleta hetki hod...

Wincuk. A jašče iznoŭ z hetym swaim hodam... Sapraŭdy, dziadźka, na što ty ŭsio hety hod tak šanuješ, z jazyka nie spuščaješ? Ludzi nie naciešacca, nie nachwalacca hodam, a dziadźka — jak hod, tak hod! Heta-ž chto-niebudź chutka zrazumieje, što dziadźku niama nikoli dobraha hodu. I hety chłapiec taksama, pačuŭšy hetkaje narakańnie, admowicca dać hrošy, Tak, dziadźka, ničoha nia budzie.

Harbuz. Wincučok, ja ani słoŭca...

Wincuk. Hetak taksama nia dobra; ja dziadźku nawuču, jak z im treba hawaryć; tolki iznoŭ, kab baby ničoha nia znali: dawiedajucca, to i ziać moža nie spadabajecca, ci tak mohuć umatać u jakuju piatlu.

Harbuz. Dyk pawodle ciabie...

Wincuk. Kažu, što prad henym chłapcom treba chwalicca, treba kazać: — usio dziakuj Bohu dobra, usiaho poŭna, tolki ziacia treba.

Harbuz. A-a! Pawodle ciabie...

Wincuk. Kažu, kali budzieš umieć z im usio jak treba, to...

Harbuz. Dyk kažaš: treba chwalicca i hrošy prasić, kab jon čaho nie dahadaŭsia.

Wincuk. Dziela hetaha to dziadźka nia bojsia. Ja z hetym chłapcom usio što treba zrabiŭ. Ja jamu kazaŭ, što ŭ was...

Harbuz. Ts. Baby jduć.

Wincuk. My jašče paśla pahaworym (*Praz lewyja dźwiery ŭwachodzić Harbuzicha i Agata: adna maje pakunak u papiery, a druhaja ŭ chustcy*).

Harbuzicha (*da muža*) I ty tut! Kab ty, baćka, mnie muku z kramy prynios; chacieła sama nieści, ale ŭ baku tak zakałoła...

Harbuz. To kupiła muki?

Harbuzicha. Nu tak, što-ž budzieš rabić: ludzi tak prosiać; kab užo tak chto, alež tut jašče i radnia...

Harbuz. Treba było adkazacca dyj usio:

Wincuk Ab čym heta dziadźka?

Harbuz. Usio z henymi swatami...

Wincuk. A, tam! znaju.

Harbuz. Ja kazaŭ — ani heta patrebna było, ani što.

Harbuzicha. Nu i wydumka twaja: woźmieš ciapier dla hetaha kila muki i radni adračešsia i ŭsiaho. Prapadzieš dziela hetaha?!

Harbuz. Prapaści, nie prapadzieš, ale biez patreby. Wydumała ni sioje, ni toje.

Harbuzicha (*wostra*). Tak i widać, što nie twaja radnia, tabie ničoha nia treba: choć kančajsia; na sabaka kość — hryzi. A nia bojsia, jak swaim, to biez kanca ŭ horła sypiš, až młosna robicca hledziačy

Harbuz. Što ty mnie hetym prytykaješ? Ty swaich nia tolki panakormliwaješ, ale jašče na darohu panapichaješ torby i to ja tabie ničoha nie hawaru.

Harbuzicha. Kab ty tak žyŭ! Widzicie

З украінскага жыцьця.

Наглы суд над Лэмыкам, які даканаў аружнага нападу ў Савецкім консуляце ў Львове. Наглы суд у Львове 30.X с.г. засудзіў Міколу Лэмыка, маладога украінскага студэнта, за забойства з матываў палітычных савецкага чыноўніка ў консуляце С.С.Р.Р. у Львове нейкага Майлова, на бясср0чную катаргу. Засуджаны Лэмык зьяўляецца сябрам тайнай арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў.

Кіеўская „Всеукраїнська Академія Наук" выключыла з сяброў Акадэміі ўсіх украінскіх вучоных з Галіччыны, бо яны не праняліся камуністычнай ідэяй.

Дзень народнай жалобы. З прычыны нячуванага голаду і тэрору ў Савецкай Украіне, у Львове паўстаў „Грамадзкі Камітэт Ратунку Украіны". Гэты Камітэт вызначыў дзень 29.X с. г. днём жалобы Украінскага народу. Польскія адміністрацыйныя ўлады забаранілі ўкраінцам у гэты дзень масава зьбірацца і ладзіць вечы. Абмінаючы забарону гэту украінскае грамадзянства і народ у гэты дзень выявілі ўсё-ж агульна народную жалобу.

У гэтай думцы лучацца з братнім Украінскім народам і Беларусы.

З Польшчы.

Сэсія Сойму і Сэнату. Прэзыдэнт склікаў звычайную сэсію Сойму і Сэнату ад 31-га кастрычніка с. г. Газэты пішуць, што гэта сэсія другім дэкрэтам будзе адложана на 30 дзён.

Пэнсіі дзяржаўных чыноўнікаў. Газэты падаюць, што ўрад прыгатаўляе новы закон аб пэнсіі дзяржаўных урадаўцаў. Найменшая плата ў месяц мае быць 100 зл., а найбольшая — 3000 зл.

Дзе Вітас і іншыя б. берасьцейскія вязьні засуджаныя на кару ў вастрог? Чэскія газэты падаюць, што Вітас, Кернік, Путэк і Багінскі знаходзяцца заграніцай і маюць у Празе чэскай распачаць палітычную дзейнасьць. З іншых жарол ведама, што паслы Лібэрман і Прагер знаходзяцца ўжо ў Парыжу.

Дэфіцыт дзяржаўнага скарбу. Урадавая статыстыка падае, што ў верасьні с. г. дзяржаўны скарб абцяжыўся недаборам на 21 мільён 887 тысяч зл.

За першае паўгодзьдзе с. г. дзяржаўны бюджэт мае недабору ўжо 237,229,000 зл.

Для каго вырабляюць цукар. Мы ўжо пісалі, што польскія і ўкраінскія сяляне ў Галіччыне, замест цукру, ужываюць вывар цукровых буракоў, а процiў гэтага выступілі фабрыканты цукраварняў. Дык чаму сяляне ў Польшчы ня купляюць фабрычнага цукру і робяць ужо свой, хатнім спосабам? А вось чаму:

За апошнія 8 месяцаў вывезена з Польшчы заграніцу 84.652 тоны цукру. Гэты цукар для заграніцы прадаюць па 11 грошаў за кілё, каб магчы конкураваць з іншымі краямі. Заграніцай з гэтага вельмі рады, а Англія польскім цукрам корміць сьвіней, бо танна яго купляе. Але трэба ведаць, што кілё цукру самой фабрыцы каштуе 50 гр., дык на вывезеным цукру за апошнія 8 месяцаў ёсьць 33 мільёны зл. страты. Але-ж гэтай стратай фабрыканты не праймаюцца, бо яе аплачвае польскі спажывец, купляючы па 1 зл. 50 гр. кілё. Дык і ня дзіва, што ў Польшчы зьмяншаецца консумцыя (спажыцьцё) цукру, а сяляне замяняюць цукар бураковай юшкай.

З заграніцы.

Нявыразнае міжнароднае палажэньне. Пасьля выступленьня Нямеччыны з Лігі Народаў, міжнароднае палажэньне сталася нявыразным. Сьпярша ў кругох міжнароднай палітыкі загуло, быццам выбухаючы вулькан, а газэты, асабліва францускія, ударылі ў вялізарны звон, што немцы самі сабе выкапалі яму і цяпер з імі ніхто ня будзе лічыцца. У сапраўднасьці аднак справа паказалася йнакш, бо няма як абмінуць 65 мільённы народ, які знаходзіцца ў цэнтры Эўропы, тымбольш, што Нямеччына станула на становішчы — „рабеце што хочаце, мы даўно разброены і нам няма патрэбы аб разбраеньні і гаварыць." Дык вось дзеля гэтага на апошнім паседжаньні разбройнай конфэрэнцыі ня было ўжо каго „разброіваць", сам ніхто разбройвацца не хацеў, дык ня было аб чым і гаварыць: узялі тады і адлажылі гэту конфэрэнцыю на... далей.

Англiцкiя соцыялісты бароняць Нямеччыну. Павадыр англіцкай апазыцыі ў сваей прамове праз радіо заявіў, што англіцкія соцыялісты будуць працівіцца кожнаму ураду, які будзе весьці палітыку прыязную да Францыі, а варожую да Нямеччыны. Кожны ўрад, нават соцыялістычны, спаткаецца з гэтай апазыцыяй, калі пазволіць уцягнуць Англію ў акцыю процiў Нямеччыны.

Англія ня думае бараніць мёртвых дагавораў. Выдатны англіцкі палітык зьмясьціў у газэце „Дэйлы Экспрэс" стацьцю, у якой, апісваючы палажэньне пасьля выступленьня Нямеччыны з Лігі Народаў, між іншым піша: „Англія ня будзе ваяваць ані за Надрэнію, ані за „польскі калідор". Не дадзёмся ўцягнуць у канфлікт у гэтых справах і ня будзем бараніць дагавораў, якія маюць быць цікавымі для праўнікоў, але нас не абходзяць. Прычына да вайны на падставе дагавору ў Лёкарно ўжо наступіла. Аб гэтым ведаем. Гітлераўскія штурмовыя батальёны яўна выступаюць у здэмобілізаванай стрэфе. Іхні штаб знаходзіцца ў Кельлі каля Штрасбургу. Паводле дагавору ў Лёкарно мы разам з Францыяй павінны выгнаць адтуль узброеных Немцаў. Аднак, ці хто з нас будзе за гэта ваяваць? Ніхто, тройчы ніхто! Могуць сабе біць у барабаны і трубіць на алярм, а нашыя міністры грозяць, каб здаволіць Францыю, але англіцкі народ на гэту вайну ня пойдзе."

Новы ўрад у Францыі ўтварыўся на чале з прэм'ерам мін. Сарро. Міністэрства заграгічных спраў затрымаў Поль Бонкур. Францускія газэты пішуць, што галоўнай мэтай сучаснага ўраду ёсьць ўпарадкаваньне нутранай гаспадаркі Францыі.

Выбары ў Нямеччыне. Дня 12 г. м. адбудзецца ў Нямеччыне галасаваньне—выбары ў парлямант. У гэтых выбарах выстаўлены толькі адзін сьпісак кандыдатаў у паслы—нямецкіх народных соцыялістаў. Дзеля

što? A pomniš wlasnoj bratu swajmu ty pazyčyŭ salomy... addaść jon tabie, tolki čakaj!

Harbuz. A twoj koła addaŭ? Dastałosia čartu u kipci, dyk wyrwi ciapier! Jašče jana mie tut prytykaje. Maja radnia—to choć ludzi dobryja, a twaja — cyhany niejkija!

Harbuzicha. Twaje horš cyhanoŭ: ni zdabra ŭ brata cyhany i načuje.

Agata (*da matki*) Mama! chwacie užo, treba jašče im, jak zachočacie, tak i zrobicie.

Harbuz. Chto užo ciabie pierahawora: heta kalaŭrot—nie jazyk.

Harbuzicha. Kaliž serca balić. Boža-ž ty moj, užo maja radnia, dyk nie radnia; a nia bojsia, jak pajedzieš, to jašče j jak nažarešsia. Jašče jon tut breša!

Harbuz O, kab jany nie dačakali, kali ja da ich...

Wincuk. Što ty tut, dziadźka! Pojdziem (*ciahnie Harbuza za ruku*).

Harbuz. A-a! Praŭdu ty kažaš... (*abodwa wychodziać*).

Agata. Ach, hety bačka, tolki i znaje: jeździć, pić dy jeści, ale kab paludzku pahawaryć...

Harbuzicha. A što ž paradziš z hetym biazmozhłym? Ci z im kudy ŭ ludzi wyjdzieš? Tolki prapadaj ŭwieś wiek u bałocie. Tolki wiedaje butelku pastawiŭšy siadzieć z bratam u karčmie... Ale pačakaj, ci ja što z kramy ŭziała? (*pierakidaje pakunki*). Droždžy jość, razynki jość... jašče hwaździki nie ŭziała: harełki treba pryhatawać; choć na pawier u Wulfichi waźmu.

Agata. Našto jšče mnie tej harełki: tam budzie harełka swatoŭ.

Harbuzicha. Nia znaješ ty hetych swatoŭ: pakul jany źbiarucca, to ja budu siadzieć, dy wačami łypać! Waźmu kwartu, dabaŭlu wady, i dobra. Što budzieš rabić, Wulfisie choć jačmieniu treba budzie prywieźci. Užo tut dziela jaho — waźmi i ad radni i ad usiaho adračysia: u mahiłu nie paniasieš...

Agata. Mama! hladzi jak hety batyst da twary, a mama nie chacieła brać... Pahladzi (*pakazwaje*).

Harbuzicha. A niachaj jaho, dačuška, niama kali. Jašče pa miašok zabiahusia da Šlomichi, što na henym tydni z redźkaj prywiazła, a ty dačuška biažy waźmi hwaździki i cynamonu.

Agata. Dyk daj hrošy.

Harbuzicha. Woźmieš tak, skažaš: jajki pradadziom i addadziom (*wychodzić praz prawyja dźwiery*).

Agata (*razhladaje batyst*) Kab jaho małanka, jak piekna wyhladaje, prosta mianiajecca (*waročaje*). Tolki kab skora nie pasypaŭsia, ale ŭsio roŭna, usio-ž trochi pafaršu, a paśla i na štodzień znašu. A ŭžo mama upiorłasia nia brać i kazała — doraha. Dobra, što żydoŭka znajomaja: mirhnuła, i ŭstupiła. Užo jana mianie wiedaje, a što tut mnie: u niadzielu wyjdu na rańniuju imšu i wyniesu z paŭkapy jajec; ci mnie heta piaršynia? Mama nia wiedaje, hdzie kury niasucca... Ech, kali paprašu Wincuka, dy jon mnie kali pašyje pa modzie, jak u paliciјancichi Bruškowaj! .. (*składaje batyst i wychodzić praz lewyja dźwiery*).

Harbuz, Wincuk i Antoś (*uwachodziać praz druhija*).

Antoś. Wot ty, brat, i wier ciapier kamu.

Harbuz. Hetak-ža, wier druhi raz.

Antoś. Dy ty, dziadźka, ŭ jaho znojdzieš sudom: ci heta mahčymaja reč, kab za čyje biedy chto ciarpieŭ. Ale wiedaj, čaławieča, druhi raz.

Harbuz. Aha, dobra kažaš: wiedaj druhi raz.

Wincuk. To kali-ž užo ty, Antoś, dziadźku moh-by? — jamu ŭžo patrebny.

Harbuz. Aha, dobra kažaš, kali-ž mohby?

Wincuk. Kali, dziadźka, termin, pazaŭtra?

Harbuz. Katoraha, ci ..

Wincuk (*pierarywajučy*). Katoraha... u kasu: katoraha, pazaŭtra kazaŭ?

Harbuz Aha, hetak; pazaŭtra, u kasu pazaŭtra.

Wincuk. Bo i niama čaho čakać, kab paśla što błahoje nia wyšła.

Harbuz. Aha, praŭdu kažaš, kab paśla błahoje što nia wyšła...

Antoś. Kali ŭžo dziadźku tak chutka treba, to pazaŭtra tut budź i ja budu i ŭsio, što treba, zrobim. Chutčej ja nie mahu.

Harbuz. Dyj čamuž, choć i ciapier... kali tolki zachočaš. Užo, Antasiok, daj tabie, Boža, zdaroŭja; štož zrobiš, kaliž sioleta hetki...

Wincuk. (*pierarywajučy i hnieŭna pahladzieŭšy na Harbuza*). Tolki ciapier z pracentam zhadziciesia i ŭsio. Mnie zdajecca ty, Antoś, ad dziadźki mnoha nia woźmieš?

Harbuz. Aha, praŭdu kaža, mnoha-ž nia woźmieš.

Antoś. Užo j sam nia wiedaju, jak tut ad dziadźki wypadała-b mnoha.

Harbuz. Aha, praŭdu kažaš, nie wypadała-b ..

Wincuk. Mnie zdajecca, jak ad dziadźki, jakuju piatku pracentaŭ... Saŭsim biez pracentu, to dziadźka chiba i sam nia pryniaŭ-by.

Harbuz. Dy peŭnie!...

Wincuk. Nu dyk kažy, skolki —i kaniec!

Antoś. Kali hetak, chaj budzie pa piać, što tut užo; Mo' Boh dašć bližej kali sujdziemsia.

Wincuk. Daj Boža!

Harbuz. Praŭdu kažaš, daj Boža...

Wincuk. To na piać hadziŭsia, dziadźka?

Harbuz. Dyk čamu-ž mnie! Tolki daj Boža, kab...

Wincuk. (*pierarywaje*). Tolki, Antoś, hladzi, kab pazaŭtra nie padwioŭ dziadźku!

Antoś. Bratka! Kali ŭžo ja raz skazaŭ, to skazaŭ, maje słowy, brat, heta bolš čymsia hrošy.

Wincuk. Hetaha tabie nichto nia wytknie dyj što i kazać, ciž ja ciabie nia wiedaju!

Harbuz. Daj, Boža, tabie Antasiok zdaroŭje; štož zrobiš, kali sioleta hetki... (*Wincuk hnieŭna pahladzieŭšy na Harbuza*).

Antoś. Dyj pakiń, dziadźka, hłupstwa i hawaryć nie wypadaje, kab ŭžo hetkaha čaławieka nia paratawać u biadzie; ja taki čaławiek, kali mnie chto padabajecca, dyk ja, zdajecca, jamu ŭsio addaŭ-by; ja hetki čaławiek...

Wincuk. Nu, a ciapier butelku, ci što?

Harbuz. Aha, dobra było-b, ale wiedaješ sioleta hetki...

Antoś. Ci nia budzie ŭžo pozna, hdzie jašče chata, pokul zawałačešsia: wypjem, jak ŭsio zakončym. Dyk kali ŭžo, dziadźka, ja mahu was adwiedać? užo-ž widzicie sami—wosień...

Wincuk. Wiedama, čaho tut čakać; tolki skarrej hetu sprawu zakončcie.

Harbuz Dobra kažaš, tolki heta zakončym.

Antoś. Nu, dyk bywajcie zdarowyja, pojdziem, daloka damoŭ... (*Usie biaruć šapki. Zasłona apuskajecca*).

Да нас пішуць.

Бруд.
(Пісьмо з Вялейшчыны.)

Шмат ёсьць такіх, што да Цябе плячыма,
Маць-Беларусь, адвернуты стаяць—
На Захад, на Усход халопскімі вачыма,
Як вяпрукі зьдзічэлыя глядзяць.
ЯСАКАР.

Сёлета ўлетку пачала выходзіць у Вільні друкаваная пабеларуску г. зв. «Беларуская Газэта,“ рэдагаваная нікому няведамым Карповічам. Адразу гэта газэціна пачала змагацца з беларускім рухам, выступаючы супроць найжыцьцяўнейшых ідэалаў беларускага селяніна і работніка. Пры гэтым пачала яна пяяць аб нядолі нашага народу ды падшывацца пад прадстаўніка і выразіцеля настрояў народных масаў. Што такое? У чым справа? — дзівіліся людзі. Але шыла з мяшка вылезла, бо-ж яго там ня ўтоіш.

„Бел. Газэта“ выдаецца беларускімі вырадкамі, якія „хоць і нашая костка, але абрасла сабачым мясам ды сьмярдзіць“, як сказаў калісь слаўны Мялешка. Зьмест „Б. Газэты“ — адзін бруд, якім ейныя рэдактары за юдавы срыбнікі хочуць узмуціць крыштальна—чыстыя хвалі нашага адраджэньня, каб ворагі маглі лавіць там сабе рыбку.

Дэмагогія „Бел. Газэты“ зусім вачавідная. У № 1 «Бел. Газэта» піша: „...беларускі народ падняў галаву і заявіў на ўвесь сьвет, што хоча быць сам гаспадаром свае краіны, сам распараджацца сваім жыцьцём, хоча сам азначыць свой лёс. Ня хоча мець накінутых яму апякуноў, а быць роўным і вольным „у сям'і нязьлічаных славян,“ хоча ўваходзіць у саюз з іншымі народамі і дзяржавамі, як самастойная адзінка. Праўда, далейшыя выпадкі падзялілі нашу краіну рыжскім нажом на дзьве аснаўныя часткі, — Усходнюю— Беларускую Сац. Сав. Рэспубліку і Заходнюю, у якой сяньня знаходзімся мы...“

Усе першыя словы — чысьцюсенькая праўда. Беларускі народ 25.III.1918 г. сапраўды заявіў вуснамі сваіх поўнапраўных прадстаўнікоў (выбраных на Ўсенародным зьезьдзе і разагнаных ня кім іншым як бальшавіцка-маскоўскімі акупантамі), што хоча быць сам гаспадаром на сваей зямлі злучанай і падзеленай на кускі і пагоніць у шыю ўсялякіх махераў Карповічаў, якія ў гэтым самым № „Газэты“ выступаюць супроць гэтае заявы, супроць акту 25 сакавіка.

Ад слова: „Праўда,...“ — пачынаецца ў „Газэце“ чысьцюсенькая няпраўда, бо хто-ж ня ведае, што ня выпадкі (на якія віну хоча зваліць Карповіч), а маскоўскія бальшавікі дзялілі ў Рызе Беларусь. А пасьля гэтага ці-ж яны супакоіліся? Не! — і далей рэзалі лучыўшую да іх Усходнюю Беларусь, аддаючы спачатку створанай фікцыйнай „Б.С.Р.Р.“ толькі маленькую частку тэрыторыі, а пасьля прырэзалі яшчэ кусочак. А рэшта? яшчэ і цяпер ня ўходзіць у склад папяровай „Бел. Соц. Радавай Рэспублікі,“ а творыць „Западную Экономічэскую Область» (якраз як даўней „Сєверо-Западный Край“) і ўваходзіць фармальна ў склад Р.С.Ф.С.Р. А Койданаўскі экспэрымэнт—справа чыіх рук? — бальшавіцкіх!

Дзіўна гучаць у «Бел. Газэце» словы: „народна адраджэнскі“, „нацыянальна-адраджэнская праца“, „нацыянальна-адраджэнскія ідэалы:“ што вырадкі з „Бел. Газэты“ разумеюць пад „беларускімі ідэаламі:“ сучаснае паняволеньне беларускага народу? Сапраўдны ідэал беларускі — акт 25 сакавіка, ідэал аб'еднаньня і самастойнасьці Беларусі яны бэсьцяць на кожным кроку. Беларускі вызваленчы рух ставяць яны ў сувязь з гітлерызмам на грунце імкненьняў да рэвізіі трактатаў. Кажуць, што мы захопліваемся плянамі Гітлера—Розэнбэрга. Сьмешна і балюча! Беларусы ад самага падзелу Беларусі да апошніх дзён змагаюцца за сваё права на існаваньне, за рэвізыю трактатаў і аб'яднаньне бел. зямель. Гітлераўскія меркаваньні тут ні пры чым, хоць-бы дзеля таго, што Беларусы-незалежнікі выступілі з гэтымі дамаганьнямі, калі аб Гітлеры яшчэ ніхто і ня чуў і няхай „Бел. Газэта“ ня пушчае дыму ў вочы, ня крычыць, што мы ўважаем панаваньне гітлераўцаў на Беларусі лепшым ад панаваньня чырвоных маскалёў. Для нас яно аднолькавае-

І нашто дурыць працоўныя масы пушчаньнем „нацтуману.“ Ці-ж „тvarыш“ Карповіч ня ведае, што такія словы, як „нац.-адраджэнскі» — высьмейваюцца цяпер у Саветах, а адраджэньне Беларусі ўважаецца за „буржуазна-кулацкую выдумку,“ а самабытнасьць Беларусі бярэцца ў чужаслове! Паводле іх толькі „матушка Расея“—самабытная.

Карповіч, ды папраўдзе і не Карповіч, бо ён тут толькі літась цігодная падстаўная фігурка, закідвае беларускім газэтам, што яны не об'ектыўныя ў падаваньні вестак з жыцьця Усх. Беларусі. Ізноў—сьведамы фальш і мана. Весткі гэтыя заўсёды—об'ектыўныя. Падаюцца так як ёсьць сапраўды —і добрыя і благія бакі жыцьця. І ня з нашай віны, а з прычыны атакі на ўсё беларускае азьвярэлага маскоўскага шовінізму цяпер гэныя благія бакі пераважаюць. А вось Карповічу, відаць, спэцыяльна нехта наказвае, каб ён ня быў об'ектыўным і пісаў аб Саветах з вялікай дамешкай хлусьні. Бо і хто-ж цяпер ня ведае, а ў нас у прыгранічнай паласе нават дзеці гэта знаюць, што раю там у Саветах няма. Што з тых цацак, як Магнітагорск, Днепробуд і трактараў, калі няма хлеба, нават з бульбяных лупін.

Ува ўсіх нумарох „Бел. Газэты“ гэтыя польска-савецкія „халуі“ б'юць на алярм, што ўвесь сьвет гатуецца да вайны з СССР., заклікаюць да абароны „бедных“ бальшавікоў ад бойні, якою страшаць беларускія працоўныя масы. І ўзноў адна хлусьня. Кожны ведае, што ад пачатку свайго паўстаньня і да апошніх дзён С.С.Р.Р. зьяўляецца аднэй з найбольш імпэрыялістычных старонак сьвету, азброенай да зубоў і таксама як усюды, сяляне і работнікі ў „чырвонай арміі“ твораць гарматняе мяса, і пад каманду пяюць: „веди Будённый нас смелее в бой!“

А што да эвэнтуальнага зьнішчэньня культурных здабыткаў Усх. Беларусі, дык таксама няма чаго пускаць дыму ў вочы. Пакуль якаяколечы вайна, дык маскалі пастараюцца консэквэнтна зьнішчыць усё тое, што стварылі дагэтуль беларусы, якія цяпер пасьсыланыя ў Салоўкі і „места не столь отдаленных“. І што за цынізм з паказваньнем пальцам на беларускіх акадэмікаў: Купалу, Коласа і цяпер прыехаўшага у Б.С.Р.Р. Тарашкевіча! Ясна ўсім, што яны голасу ня маюць і мець ня будуць, бо йнакш будуць „інтэрнацыяналізаваны“ на Салоўкі, або згінуць, як Ігнатоўскі.

Пішаце ўрэшце „таварышы“ з „Б. Газ.“, што вам стараецца нехта прышчапіць камунізм. За вялікага сябе вымагаеце гонару! Было-б нішто, каб вы былі ідэйнымі беларускімі камуністамі. Але вы скурнікі, прадажнікі, вырадкі свайго народу і ў гэтым ваша найслабейшая старана. Не сягоньня дык заўтра, а вас пазнаюць усе.

Вялейка 19 Х.33. **Палачанскі.**

Беларусы полёнізацыі не паддающца.
(Пісьмо з пад Дзісны.)

Апошнім часам каля нас нарасло польскіх арганізацыяў, як грыбоў пасьля дожджу. Папісалі беларускую моладзь у польскія „колы“, але «колы» гэтыя ніяк ня круцяцца. Мэта гэтых арганізацыяў усім ведама: полёнізацыйная; дык і ў „колы“,каб закруціліся,дзьмухаюць з цэнтраў польскі дух. Тымчасам у гэтых „колах“ адпірае польскі дух мяйсцовая прыродная беларуская сіла. Дык польскія „колы“ ані руш з мейсца — стаяць, як укапаныя. Я, пішучы аб гэтым, сам належу афіцыяльна да аднае такой польскай арганізацыі. Ды ня толькі я адзін, нас такіх у ваколіцах трэба лічыць на дзесяткі. Мы ведаем, што мы павінны рабіць у гэтых польскіх „колах“ і мы сваю работу робім. Пішу аб гэтым у газэту ня дзеля таго, каб сьмецца з гэтых „колаў“, а дзеля таго, каб паведаміць нашых сяброў у другіх ваколіцах аб беларускай рабоце ў польскіх арганізацыях. Мы час ад часу, каб выступіць шырэй, ладзім беларускія прадстаўленьні, а дзе йшчэ не акрэпла наша арганізацыя ў „колах“, усьведамляем сяброў. Веру, што прыдзе час і на мейсца „колаў“ паўстануць свае беларускія арганізацыі — гурткі Беларускага Інстытуту Гасп. і Культуры. Беларускім дзеячом гэтым падаю да ведама, што народна-беларускі рух жыве і сярод беларускай моладзі, запісанай у польскія „колы“. Беларуская моладзь і ў гэтых „колах“ душой з Вамі. Спосаб даставаньня беларускіх кніжак і газэт мы маем. Адна просьба: даць нам танную кніжку, бо на вёсцы цяпер вельмі цяжка на залатоўку.

Да сяброў польскіх „колаў“ зьвяртаюся з заклікам: на ўсялякія зьезды і рэпрэзэнтацыі, як паездкі на дажынкі і інш. дэлегуйце разьбітных і стойкіх хлапцоў. Трэба так-жа навязаць сувязь і з дзяўчатамі, бо ня мала запісана ў „колы“ іх.

На заканчэньне скажу: будучы ў польскіх арганізацыях, не забываймася, што мы беларусы і што мы, беларуская моладзь, зьяўляемся будучыняй нашага многапакутнага Беларускага народу.

Ведаючы, што рэдакцыя ня мае моральнага права выявіць аўтора артыкулу, вышэйсказанае з патрэбы апісаў і спадзяюся, што гэткім спосабам будзем інфармаваць аб беларускім жыцьці ў польскіх „колах“ далей з усіх куткоў нашай старонкі. Дык пішэце, сябры, аб справах патрэбных адны другім і шырэйшаму беларускаму грамадзянству.

Сябра польскага „кола“ на беларускіх землях.

гэтага трэба спадзявацца, што пройдуць яны ўсе ў парлямант, як у нас у Зах. Беларусі у апошніх выбарах прайшлі кандыдаты з сьпіску Б.Б.

Лік палітычных вязьняў у Нямеччыне. Паводле газэтных вестак у Нямеччыне інтэрнавана 22.000 палітычных вязьняў.

Абядненьне Амэрыкі. Старшыня амэрыканскай фэдэрацыі працы сьцьвердзіў, што ад сакавіка с. г. знайшло працу 3 мільёны безработных. Аднак гэта ня шмат памагло, бо астаецца йшчэ без работы больш 10 мільёнаў людзей. Каб даць гэтым безработным працу, хочаць у Амэрыцы завясьці 30 гадзінны тыдзень працы. Гэта значыць, каб больш работнікаў працавала, а дзеля гэтага працаваў кожны па 5 гадзін у дзень.

Бальшавікі шукаюць капіталу. Амэрыка з Саветамі завялі флірт не на дарма. Амэрыканскія капіталісты ня маюць куды ўткнуць свае капіталы, каб яны ім давалі даходы, а бальшавіком на гвалт патрэбныя грошы. Дык вось і пачаўся пралетарска-капіталістычны флірт. Пралетарска-савецкая дзяржава—СССР. стараецца дастаць у Амэрыцы 500 мільёнаў даляраў пазычкі, каб купіць за 400 мільёнаў даляраў шынаў для свае чыгункі і за 100 мільёнаў даляраў бавоўны.

Арышты ўкраінцаў у Савецкай Украіне. Маскоўская камуністычная ўлада таксама жорстка распраўляецца ў Савецкай Украіне з украінцамі, як і з беларусамі ў Савецкай Беларусі. Апошнімі часамі арыштавана там многа ўкраінскіх вучоных і выселена ў далёкія краіны Расеі.

Бальшавікі гатуюцца да вайны на Далёкім Усходзе. Газэты падаюць, што да манджурскай граніцы з Расеі кожную гадзіну йдзе цягнік за цягнікам, вязучы туды войска амуніцыю і прадукты. На манджурскай граніцы вельмі ўжо многа войска і там штодня чакаюць пачатку японска-савецкай вайны.

Бальшавікі аб забойстве ў савецкім консуляце ў Львове. Маскоўская газэта „Известия“ піша, што львоўскае забойства цесна зьвязана з проціўбальшавіцкім настроем сярод украінскага насяленьніцтва. Гэтае забойства, цьвердзяць бальшавікі, мела на мэце перашкодзіць у прыязьні Саветаў з Польшчай.

Арабы проціў Жыдоў. Калі пачалі наяжджаць у Палестыну з усяго сьвету Жыды, Арабы пачалі працівіцца гэтай эміграцыі. Адносіны Арабаў да Жыдоў у Палестыне пачаліся вельмі варожыя. Англіцкая ўлада ў Палестыне ўсьцяж бараніла Жыдоў. Але вось апошнім часам пачаліся там дэманстрацыі Арабаў проціў Жыдоў, а так-жа і выступленьні проціў англіцкай улады. Англіцкая ўлада, усьміраючы Арабаў, пусьціла ўход азброеную паліцыю і войска. Палілася кроў. Многа забітых, а яшчэ больш раненых.

З Вільні.

Прафэсары пакідаюць Вільню. У сувязі з скасаваньнем на Віленскім Унівэрсытэце раду катэдраў, з Вільні выяжджае гэтымі днямі цэлы рад выбітных прафэсароў, якія на скасаваных аддзелах навучалі.

Курс грашэй. За доляр плацяць 5 зл. 82 гр., а за рубель золатам — 4 зл. 70 гр.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.